ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
25
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 11 (1349)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## 60-годдзю ўтварэння СССР — дастойную сустрэчу!




### ДРУГІ ГОД

лепшыя студэнцкія групы механіка-матэматычнага факультэта ўдастойваюцца права праводзіць грамадска-палітычную атэстацыю ў выглядзе камсамольскага заліку. У такіх групах атэстацыйныя адзнакі кожнаму камсамольцу ставіць не прызначаная раней камісія, а ўвесь калектыў.

**А. ЛІПА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола мехмата па аргрaбоце.**

### СУСТРЭЧА БАЦЬКОЎ

першакурснікаў з выкладчыкамі факультэта стала традыцыйным мерапрыемствам на фізфаку. Праграма чарговай сустрэчы складалася з выступлення прадстаўнікоў дэканата перад бацькамі студэнтаў, канцэрта мастацкай самадзейнасці першакурснікаў, экскурсіі па лабараторыях факультэта і гутаркі з куратарамі груп.

**І. КАЙРАЙЦІС.**
**студэнтка І курса фізфака.**

### ЛЕПШАЙ ГРУПАЙ

па выніках першага семестра на ФПМ прызнана 9-я група другога курса. Пераможцам уручаны білеты ў Дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета БССР на балет «Стварэнне сусвету».

**Р. МАРЧУК,**
**старшыня прэс-цэнтра прафкома.**

### СТАГОДДЗЮ

з дня нараджэння песняроў беларускага народа Я. Купалы і Я. Коласа прысвечаны чарговы адкрыты агляд кніг, арганізаваны універсітэцкай бібліятэкай. У чатырох тэматычных раздзелах прадстаўлена каля 200 выданняў.

**А. ЛУКАШЭВІЧ.**

### ПЕРШЫЯ ДВА МЕСЦЫ

на гарадскім конкурсе маладых выканаўцаў камсамольска-маладзёжнай песні, які праходзіў у Палацы культуры тэкстыльшчыкаў, занялі саліcты універсітэта. Народная капэла БДУ ўзнагароджана дыпломам III ступені.

**Л. БАРАНОЎСКАЯ,**
**інструктар студэнцкага клуба.**

### ЗАВЯРШЫЛІСЯ

спаборніцтвы па футболу ў праграме спартакіяды замежных студэнтаў БДУ. Першае месца заняла каманда факультэта журналістыкі.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

● МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

## НАПЕРАДЗЕ — СУМЕСНАЯ РАБОТА

**БЕЛАРУСКІ** дзяржаўны універсітэт — нібы мініяцюрны зямны шар. У яго сценах займаецца 897 студэнтаў з 68 краін свету.

Адной з форм супрацоўніцтва камітэта камсамола БДУ і зямляцтваў замежных студэнтаў стала заключэнне двухбаковых дагавораў аб сумеснай дзейнасці. Мэта гэтых дагавораў — зрабіць супрацоўніцтва з зямляцтвамі больш планамерным, разнастайным, глыбей пазнаёміць замежных студэнтаў з савецкай рэчаіснасцю, з другога боку — расшыраць кругагляд савецкіх студэнтаў у галіне гісторыі, эканомікі, палітыкі, культуры іншых краін свету. Зараз інтэраддзел камітэта камсамола універсітэта праводзіць кампанію па заключэнню і перазаключэнню двухбаковых дагавораў.

Нядаўна быў падпісаны дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве паміж камітэтам камсамола і гарадскім камітэтам Дэмакратычнай арганізацыі моладзі Афганістана. Студэнты з ДРА заўсёды актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці універсітэта. Яны часта выступаюць перад савецкімі студэнтамі з расказамі аб сваёй краіне, з канцэртнымі праграмамі, працуюць на інтэрнацыянальных суботніках і ў студэнцкіх будаўнічых атрадах.

І вось новай прыступкай у развіцці брацкіх адносін савецкіх і афганскіх студэнтаў стала падпісанне двухбаковага дагавора. На пасяджэнне, прысвечанае гэтай падзеі, прыйшлі камсамольскія актывісты універсітэта і актыў гарадской арганізацыі ДАМА. Нур Алі і Масуд Васель расказалі аб дружбе афганскага і савецкага народаў, аб той вялікай дапамозе, якую аказвае СССР іх краіне.

Цесныя брацкія адносіны звязваюць народы СССР і Афганістана. Пачатак ім паклаў міжнародны дагавор 1921 года, натхніцелем якога быў Уладзімір Ільіч Ленін. У памяць аб гэтым удзельнікі пасяджэння ўсклалі кветкі да бюста правадыра сусветнага пралетарыяту.

І вось нарэшце наступіў урачысты момант. Аляксандр Новік, намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ і Масуд Васель, сакратар гаркома ДАМА паставілі ўласныя подпісы пад сумесным дагаворам, затым абмяняліся памятнымі сувенірамі. Пасля пасяджэння ўсе прысутныя наведалі музей Белдзяржуніверсітэта.

Дагавор заключаны, наперадзе вялікая работа па яго выкананню.

**В. ШАДУРСКІ.**

● МАРШ МІРУ

## «Лічым абавязкам...»

СТУДЭНТЫ-ПЕРШАКУРСНІКІ гістарычнага факультэта сабраліся на мітынг, каб паставіць свае подпісы пад тэкстам пісьма-пратэсту ў адрас брусельскай штаб-кватэры НАТО, які прапанавалі маладыя рабочыя «Растсельмаша». Мітынг адкрыў партгрупорг курса А. Юшкевіч. Ён расказаў аб шырокім распаўсюджанні руху «Марш міру». Студэнтка З. Ільясевіч напомніла прысутным, якія беды прыносіць гонка ўзбраенняў усім народам свету.

Гучыць песня барацьбіта за мір, амерыканскага спевака Дзіна Рыда. Адзін за адным ставяць свае подпісы юнакі і дзяўчаты пад палымянымі словамі ў абарону міру...

Мы, студэнты першага курса гістарычнага факультэта, лічым абавязкам кожнага савецкага грамадзяніна падпісацца пад пасланнем пратэсту і заклікаем да гэтага ўсіх студэнтаў Белдзяржуніверсітэта.

**І. КРЫШТОН,**
**сакратар камсамольскага бюро першага курса гістфака.**

**ПІСЬМО ПРАТЭСТУ, НАКІРАВАНАЕ Ў ШТАБ-КВАТЭРУ НАТО, САБРАЛА 560 ПОДПІСАЎ НА ФПМ, 385 — НА ЮРЫДЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ, БОЛЬШ 800—НА МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫМ, 340 — НА ГІСТАРЫЧНЫМ, 350 — НА ХІМІЧНЫМ.**
**МАРШ МІРУ ПРАЦЯГВАЕЦЦА!**

### ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ АТЭСТАЦЫЯ





Паспяхова прайшла грамадска - палітычная атэстацыя на трэцім курсе факультэта журналістыкі. На здымках нашага карэспандэнта В. Шачака вы бачыце імгненні атэстацыі.



## Пацвердзім справамі

ЗАРАЗ, напярэдадні XIX з'езда ВЛКСМ, на ўсіх факультэтах нашага універсітэта праводзіцца грамадска-палітычная атэстацыя студэнтаў.

Старшынёй атэстацыйнай камісіі першай акадэмічнай групы першага курса факультэта журналістыкі быў Герой Савецкага саюза прафесар Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі. У састаў камісіі ўвайшлі таксама куратар групы Н. П. Дзенісюк, член камітэта камсамола факультэта камуніст І. Ф. Ляшчонак, камсорг групы С. Дзюбайла.

Усе камсамольцы групы на працягу першага семестра прымалі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці факультэта і універсітэта, паспяхова здалі сваю першую сесію. Адны з самых актыўных камсамольцаў групы — Ігар Зыбайла, Валянцін Жданко, Анжэла Каранік, Святлана Вяроха.

Усе камсамольцы паспяхова вытрымалі залік. Наперадзе яшчэ шмат работы. Кожны з нас добрымі і карысным справамі імкнецца пацвердзіць высокае і ганаровае званне камсамольца.

**Ж. МІХАЙЛАВА,**
**студэнтка журфака.**



# Цаліна ўзнята — подзвіг працягваецца!

«ЦАЛІНА ЎЗНЯТА — ПОДЗВІГ ПРАЦЯГВАЕЦЦА!» —такімі словамі сустрэла мяне актавая зала Беларускага дзяржаўнага універсітэта. На сценах—газеты студэнцкіх будаўнічых атрадаў «Таварыш», «Спадчына», «Світанак», «Алеся»... Яны расказваюць аб мінулым працоўным семестры СБА універсітэта, байцы якіх прыйшлі на сустрэчу з былымі студэнтамі БДУ, удзельнікамі першага студэнцкага цаліннага атрада.

На экране кадры кінастужкі, якая стала гісторыяй. Едуць студэнты ў неабжыты стэп — туды, дзе патрэбна было пачынаць з нуля, дзе чакалі іх незлічоныя цяжкасці, дзе патрэбны былі маладыя працоўныя рукі.

Выхаванцы БДУ аднымі з першых адазваліся на заклік партыі. Студэнт філфака Косця Цыбулька ад імя ўсяго свайго курса звярнуўся ў камітэт камсамола з просьбай паслаць іх на цаліну. У 1956 годзе на базе універсітэта быў арганізаваны першы цалінны студэнцкі атрад. Камандзірам атрада стаў Яўген Бабосаў.

...Дырэктар Інстытута філасофіі і права АН БССР, доктар філасофскіх навук, член-карэспандэнт АН БССР Яўген Міхайлавіч Бабосаў успамінае зараз:

**— Я ў гэтай зале не першы раз, і выступаць даводзілася не аднойчы, але, мабыць, гэтак яшчэ ніколі не хваляваўся. Гэта сустрэча не толькі з сябрамі, з родным універсітэтам, гэта сустрэча з самым светлым і дарагім, што ёсць у чалавека, — з камсамольскім юнацтвам. Шчаслівы той, хто зможа зберагчы сваё сэрца маладым да канца сваіх дзён.**

**У той час ніхто з нас не думаў пра заробак. І можа гэта высокія словы, але ў сілу свайго камсамольскага абавязку, патрыятызму, маладога энтузіязму мы не маглі стаяць у баку ад вялікіх падзей, якія разгортваліся вакол нас. Ехалі мы на цаліну ў таварным цягніку. Ніл Гілевіч, зараз вядомы беларускі паэт, напісаў лозунг: «Дадому ніводны з нас не паедзе, пакуль не ўбяром увесь ураджай да зерня!»**

**Працавалі мы ў розных калгасах, не шкадуючы ні сваіх сіл, ні часу. Аднойчы, у канцы жніўня, вечарам стала набліжацца навальніца. Шмат зерня магло загінуць. Парторг калгаса звярнуўся за дапамогай да рабят. Усю ноч ратавалі зерне, ніводны не застаўся ў баку. Іменна тут мы адчулі сілу калектыўнай студэнцкай працы.**

**Так, мы сёння ўжо не тыя, якімі былі больш чым дваццаць гадоў назад, але ў кожнага з нас сэрца па-ранейшаму застаецца камсамольскім. Маё самае запаветнае жаданне ў гэты момант — зноў адчуць сябе байцом студэнцкага будаўнічага атрада.**

**Самае галоўнае, што нас звязвала і звязвае, — моцная дружба. Я веру ў непахісную сілу студэнцкай камсамольскай дружбы. Праходзіць маладосць, застаецца за спіной вучоба ва універсітэце, але ніколі не пакідае сэрца чалавека адданасць ідэалам юнацтва. Жадаю ўсім прысутным заўсёды, у кожнай вялікай ці малой справе заставацца камсамольцамі.**



Выступае былая студэнтка біялагічнага факультэта, цяпер навуковы супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута Надзея Вікенцьеўна Бутурыцкая:

**— Цаліна — гэта не толькі этап у жыцці нашай краіны, для нас гэта была яшчэ і пара асабістага станаўлення. Усе мы вынеслі атакі родных і атрымалі ў камітэце камсамола камсамольскую пуцёўку колеру пшанічнага хлеба. Не забудуцца ніколі і сямідзённы пераезд на таварняку, і танцы каля вагончыка, і паездка за кавунамі ў суседнюю брыгаду, і палаткі на сорак чалавек. Запомнілася ўсё-ўсё.**

**Каштоўны першы цалінны хлеб... Ніякія цяжкасці не змаглі патушыць агонь маладых камсамольскіх сэрцаў. Можа не выпадкова першым фільмам, які мы паглядзелі на цаліне, быў «Авадзень».**

**А яшчэ запомніўся цалінны чай: уявіце сабе салёную ваду, якую закіпяцілі, а потым яшчэ пасаладзілі...**

Расказвае намеснік рэдактара БелСЭ Іван Саламініч. Яго брыгада за ўдарную працу была ўзнагароджана пераходным Чырвоным сцягам.

**— З намі разам працаваў Грыша Барадулін. Зборнік яго вершаў «Маладзік над стэпам» нарадзіўся на цаліне. У яго ўвайшлі вершы «Вечар над Таболам», «Насціна кухня...» А варыла тая Насця незвычайнага смаку баршчы і кашы...**

Слухаючы выступленні гэтых людзей, дакранаешся сэрцам да гісторыі, да тых гераічных дзён, адчуваеш здзіўляючую сілу пераемнасці пакаленняў.

**Ж. ЖМАЙЛІК.**

**НА ЗДЫМКАХ: выступае камандзір атрада першацаліннікаў Я. М. Бабосаў; нашчадкі першацалліннікаў.**

Фота **В. Шачака.**



**ДА ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ**

# У добры шлях

**У МІНУЛЫМ ГОДЗЕ САКРАТАРЫЯТ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ЖУРНАЛІСТАЎ БССР І САВЕТ ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ЗАЦВЕРДЗІЛІ ПАЛАЖЭННЕ АБ ШТОГАДОВЫМ СТУДЭНЦКІМ КОНКУРСЕ «ЛЕПШАЯ ПУБЛІКАЦЫЯ І ТЭЛЕРАДЫЁПЕРАДАЧА ГОДА». МЭТА КОНКУРСУ — ПАЛЯПШЭННЕ ПАДРЫХТОЎКІ МАЛАДЫХ ЖУРНАЛІСЦКІХ КАДРАЎ І ВЫЯЎЛЕННЕ СЯРОД ІХ НАЙБОЛЬШ ЗДОЛЬНЫХ ТВОРЧЫХ РАБОТНІКАЎ ГАЗЕТ, РАДЫЁ І ТЭЛЕБАЧАННЯ.**

**І ВОСЬ ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ КОНКУРСУ. ХОЧАЦЦА НЕКАЛЬКІ СЛОЎ СКАЗАЦЬ ПРА ЯГО ЛАЎРЭАТАЎ.**

**Рашэнне журы конкурсу: а) прысудзіць першую прэмію ў размеры 50 рублёў Алене Мозалевай, студэнтцы III курса за матэрыялы «Пісьмо» і «Ці патрэбны калгасу швачкі!», якія былі апублікаваны ў «Сельской газете».**

Як журналістка Алена Мозалева цікавая ўжо тым, што яна, гарадская дзяўчына, піша пра сучасную вёску, пра яе праблемы і «справы жыцейскія». А гэта, згадзіцеся, не кожнаму з нас, нават патомнаму вяскоўцу, пад сілу. Чытачы «Сельской газеты», думаю, заўважылі і належным чынам ацанілі яе майстэрства, як ацаніла яго журы конкурсу. А вось сама Алена адразу не паверыла ў тое, што атрымала першую прэмію.

— Праўда, не паверыла. Да таго часу не верыла, пакуль не прачытала аб выніках конкурсу.

А потым? Потым было такое ўражанне, быццам крылы за спіной выраслі. Захацелася пісаць так, як яшчэ ніколі не пісала. Паявілася вера.

**Рашэнне журы конкурсу: б) прысудзіць другія прэміі ў размеры 30 рублёў:**

**І. Аляксандру Раўбе, студэнту VI курса, за серыю каляровых здымкаў.**

**2. Галіне Сачанка, студэнтцы IV курса, за матэрыял «Паверыць у крылы», змешчаны ў часопісе «Маладосць».**

Думаю, кожны, хто наведваў у апошні час факультэт журналістыкі, звярнуў увагу на выстаўку фотаздымкаў студэнта-завочніка Аляксандра Раўбы. Яго аб'ектыў адлюстраваў і прыгажосць роднага краю, і яго працавітых людзей, мінулае Беларусі і сённяшні дзень рэспублікі. Адчуваеш, што для Аляксандра фатаграфія — не проста работа, не проста выкананне службовага абавязку, а нешта большае. Ён умее адшукаць цікавую дэталь, прыкмеціць той ці іншы факт з яго галоўнага, унутранага боку. Таму і мова фатаграфіі А. Раўбы вобразная, яркая, жывая, заклікае кожнага з нас да роздуму. А якраз у гэтым і праяўляецца сіла мастацтва.

— Самае цяжкае — выконваць тое, што запланавана на дзень. Кожную гадзіну столькі цікавага адбываецца. І парушаеш свой план. Але можа гэта і ёсць творчае жыццё? — гаворыць Галіна Сачанка.

Галю вабіць складаны свет мастацтва. Аб чым бы яна ні пісала — няхай гэта рэцэнзія на спектакль ці кінафільм, размова аб дойлідстве ці народнай творчасці,— адчуваецца свежасць думкі, сваё разуменне праблемы. Упэўніваешся, што Галіна, перш чым сесці за пісьмовы стол, старанна вывучае і апрацоўвае сабраны матэрыял, выношвае кожны сказ, кожнае слова ў сэрцы.

Памятаю, з якой цікавасцю прачытаў у «Маладосці» яе замалёўку-партрэт аб маладой артыстцы ТЮГа Г. Кухальскай. Матэрыял, пабудаваны на ўспамінах, уражаннях і параўнаннях, заінтрыгаваў асабістым падыходам да раскрыцця вобраза, нейкай улюбёнасцю ў сваю гераіню. Гэта была спроба паказаць «імгненні палёту на сцэне, у тэатры» праз лёс і творчасць маладой артысткі, праз яе ўчарашніх і заўтрашніх герояў. І няхай яшчэ не ўсё атрымліваецца ў Галіны, няхай часам не хапае звычайнага жыццёвага вопыту, верыш — Г. Сачанка знойдзе сябе.

**Рашэнне журы конкурсу: в) прысудзіць трэція прэміі ў размеры 20 рублёў:**

**1. Сяргею Ляпічу, студэнту V курса, за матэрыял «Сляды на зямлі», перададзены па Беларускаму радыё.**

**2. Алене Паўлавай, студэнтцы V курса, за матэрыял «Гран-«Мішэль», апублікаваны ў газеце «Вечерний Минск».**

**3. Людміле Чыжовай, студэнтцы V курса, за матэрыял «Калі пойдзе дождж», апублікаваны ў газеце «Знамя юности».**

Ужо той факт, што трэцяе месца падзялілі паміж сабой пяцікурснікі журфака, гаворыць аб іх настойлівым пошуку сваей тэмы, свайго «пункту прыкладання сіл». Алена Паўлава і Людміла Чыжова — газетчыцы, Сяргей Ляпіч супрацоўнічае з Беларускім радыё. Розная ў іх манера пісьма, розны падыход да раскрыцця тэмы. Людміла часта ўжывае лірычныя адступленні, параўнанні, паралельныя канструкцыі, імкнецца надаць кожнаму сказу эмацыянальнасць, насычанасць.

Алена Паўлава ў інтэрв'ю «Гран-Мішэль» абапіраецца больш на факты, дакументы. Але «сухім» яе матэрыялназваць нельга: тут адчуваюцца аўтарскае «я», уласныя перажыванні.

— Конкурс — справа патрэбная,— гаворыць Сяргей Ляпіч. Яго матэрыял пра нялёгкую хлебаробскую працу, пра пераемнасць пакаленняў, аб вернасці раз і назаўжды выбранай прафесіі, упэўнены, нікога не пакінуў абыякавым.

— Я быў прыемна здзіўлены і ўзрадаваны, калі даведаўся, што стаў лаўрэатам конкурсу на лепшую публікацыю і тэлерадыёперадачу. І ў той жа час пашкадаваў, што хутка закончу факультэт.

**А. ЛАЗОЎСКІ.**

**● РАДКІ З ПІСЬМАЎ**

# «Дзякуй, людзі!»

КАЛІ я паступіў ва універсітэт, стан майго здароўя быў вельмі дрэнны. Праз некаторы час я цяжка захварэў. Тады і адбылася мая першая сустрэча з тэрапеўтам Т. В. Слаўкінай. Яе прафесіянальнае майстэрства, чулае сэрца, шчырае слова не далі мне ўпасці духам, а прыдалі надзею на выздараўленне. Хутка мяне апераравалі. Прайшоў нейкі час, і я вярнуўся на свой родны філалагічны факультэт. Цяжка было адразу ўліцца у напружаную вучобу. На дапамогу прыйшлі аднакурснікі і выкладчыкі факультэта.

Як радасна адчуваць сябе здаровым чалавекам, ісці разам з усімі ў нагу! Які я шчаслівы!!!

Гэту радасць, шчасце мне падарылі цудоўныя людзі. Хочацца шчыра падзякаваць усім, хто дапамог мне вярнуцца да паўнацэннага жыцця. Дзякуй і вам, Тамара Васільеўна, за вашу высакародную, святую працу!

**У. ГОЛУБЕЎ,**
**студэнт філфака.**

● ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

# ПЕРШЫЯ КРОКІ «ЮНАЦТВА»

ВЯСНОВАЕ сонца ўжо напамінае аб леце. І пальцы самі перабіраюць струны гітары, словы паходнай песні ўспамінаюцца ўсё часцей. А позірк затрымліваецца на рукзаку, які ўпарта чакае свайго часу: ужо хутка збірацца ў будаўнічы атрад.

Першакурснік, наслухаўшыся сваіх шматвопытных старэйшых сяброў, ужо з сакавіка пачынае пісаць заявы з просьбай залічыць яго байцом СБА.

Чым жа так прыцягвае будатрад першакурснікаў? Нам адказваюць студэнты пятай групы радыёфізічнага факультэта

**Святлана Сінякова:**

— Кажуць, нідзе так не пазнаюць сваіх сяброў-аднакурснікаў, як у будаўнічым атрадзе. Агульныя мэты, агульныя радасці, агульны дах над галавой. Я хачу ўбачыць сябе і сваіх аднакурснікаў у рабочай спяцоўцы.

**Ганна Падашэўка:**

— Мае старэйшыя сябры шмат расказвалі аб жыцці ў будатрадзе. Усе яны сцвярджаюць, што гэта самае цікавае ў студэнцкія гады.

**Аляксандр Сіманкоў:**

— Хачу праверыць сябе, паглядзець, на што я здатны. Лекцыі, залікі, экзамены — гэта адно, а сур'ёзная работа — гэта зусім іншае.

**Валерый Маліноўскі:**

— Будатрад — гэта неабходны і вельмі важны этап у жыцці кожнага студэнта. Ён вучыць сур'ёзным адносінам да даручанай справы, пачуццю калектывізму.

«Рыхтуй летам сані, а зімой — калёсы» — вучыць народная мудрасць. З ёю згодны студэнты першага курса факультэта радыёфізікі. Ужо цяпер яны зрабілі вельмі многа для стварэння будаўнічага атрада «Юнацтва», які летам будзе працаваць на заводзе жалезабетонных вырабаў у Капыльскім раёне.

У пачатку сакавіка студэнты правялі агульны сход, на якім было канчаткова вырашана, хто можа назваць сябе байцом атрада. Улічваліся дысцыпліна студэнта, вучоба, удзел у грамадскім жыцці. Такім чынам былі адабраны 24 байцы.

Ганаровым байцом атрада з'яўляецца Мікалай Гастэла. «Юнацтва» робіць свае першыя працоўныя крокі. Гэта —тры суботнікі, праведзеныя ў мясцовай гаспадарцы. Студэнты дапамаглі калгаснікам накрыць цяпліцы. Намечана правесці яшчэ два суботнікі. Акрамя таго, вырашана прачытаць у падрыхтоўчы перыяд пяць лекцый, правесці тры выступленні агітбрыгады, выпусціць некалькі насценгазет. Усё гэта запісана ў сацыялістычных абавязацельствах, якія былі прыняты на агульным сходзе. Першым пунктам іх значыцца: дабіцца таго, каб у летнюю сесію сярэдні бал паспяховасці байцоў будатрада быў не ніжэй чацвёркі.

**А. КАРАНІК,**
**Н. КУРБАЦКАЯ.**

## УВАГА—КОНКУРС!

**САКРАТАРЫЯТ праўлення Саюза журналістаў БССР, калегія Міністэрства ўнутраных спраў рэспублікі, прэзідыум Рэспубліканскага савета таварыства аўтамотааматараў пастанавілі правесці конкурс на лепшае асвятленне пытанняў бяспекі руху газетамі рэспублікі.**

**Конкурс, у якім прымае ўдзел і наша газета, праходзіць з 1 студзеня па 1 лістапада 1982 года. Яго мэта — далейшая актывізацыя работы рэдакцыйных калектываў газет па прапагандзе пытанняў бяспекі руху, прыцягненне ўвагі шырокай грамадскасці да праблем аўтамабілізацыі, а таксама для аб'яднання і каардынацыі намаганняў журналістаў, работнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, прадстаўнікоў грамадскасці ў справе ўмацавання дарожнай дысцыпліны сярод удзельнікаў руху.**

**Разам са штатнымі работнікамі рэдакцыі да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца работнікі ДАІ, прадстаўнікі грамадскасці, а таксама ўсе чытачы нашай газеты.**

**Матэрыялы, якія прысылаюцца на конкурс, будуць публікавацца пад рубрыкай і эмблемай «Прэсаўтаклуба».**

СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС

# ПРЫЗВАНЫ ПАМЯЦЦЮ



...ЯГО ПЕРШАЯ карціна называлася «Песня». Светлая, сонечная, яна была напоўнена галасамі маленства, роднай вёскі, роднай зямлі, яе людзей, стваральнікаў мірнага жыцця.

«Песню ствараці ясну, як
неба,
У кожнай з ёй хаце быць
мілым гасцём...»

Здаецца, гэтыя купалаўскія радкі з'яўляюцца лейтматывам творчасці народнага мастака СССР Міхаіла Андрэевіча Савіцкага. Пачынаючы з першай карціны, ён стварае сваю, не падобную на іншыя, цудоўную песню. Сапраўды, яго палотны гучаць. Гучаць, як гімн дабрацe, чалавечнасці, мацярынству, міру...





Читателям газеты „Беларускі універсітэт"

18.03.82

Нядаўна па запрашэнню грамадскіх арганізацый БДУ М. А. Савіцкі сустрэўся са студэнтамі і выкладчыкамі універсітэта. Са словамі шчырага прывітання да мастака звярнуўся старшыня савета ветэранаў БДУ І. В. Марчанка. Ён расказаў аб гераічным ваенным шляху М. А. Савіцкага, які пакінуў глыбокі след у яго творчасці.

Асаблівы тон размове з мастаком надала паказаная ў пачатку сустрэчы кінастужка «Апаленая памяць». На экране ажылі вобразы з палотнаў М. Савіцкага, загаварылі галасамі пратэсту, журбы, радасці...

«Партызаны. Блакада», «Віцебскія вароты», «Пакаранне смерцю» — трывожныя, трагічныя фарбы і побач — «Партызанская мадонна», яркая, жыццесцвярджальная. Жыццесцвярджальнымі можна лічыць усе творы М. Савіцкага, нават тыя, што ўваходзяць у цыкл «Лічбы на сэрцы». Бадай, яшчэ ў большай ступені, чым іншыя. Карціны з гэтага цыкла не былі паказаны ў фільме (іх мастак стварыў пасля выхаду стужкі на экран), але іх подых адчуваецца ва ўсім. Разумееш, што зварот мастака да тэмы, адлюстраванай у палотнах «Спяваюць камуністы», «Мадонна Біркенау», «Танец з факеламі» і іншых, аб'яднаных цыклам, быў заканамерны.

— Многія таварышы, з якімі я перанёс усе пакуты знаходжання ў канцлагерах, загінулі. А я застаўся жывы. Гэта быў мой абавязак расказаць аб тым, што засталося ў памяці,— гаварыў на сустрэчы Міхаіл Андрэевіч.— Але мае карціны не толькі аб тым, што было калісьці, яны — увогуле пратэст супраць антылюдзей, антычалавечнасці, яны цалкам за гуманізм.

...Некалькі эпізодаў фільма былі зняты ў майстэрні М. Савіцкага. Мы ўбачылі, як уважліва распрацоўвае ён кожную дэталь, як натхнёна піша свае карціны. Перад намі паўстае вобраз Савіцкага-мастака, таленавітага, патрабавальнага да сябе і іншых, нецярпімага да павярхоўнасці, абыякавасці.

— У кожнай творчай рабоце вырашаецца праблема прыгожага. Без гэтай праблемы няма мастацтва.

Так лічыць Савіцкі-мастак. Размова аб гэтым ішла і на сустрэчы, пасля таго, як патух экран і зніклі апошнія кадры фільма.

Міхаіл Андрэевіч гаварыў аб сваім разуменні сутнасці выяўленчага мастацтва, аб этапах творчага працэсу. І зрабіў акцэнт на галоўным:

— Мастацтва з'яўляецца той галіной, якой чалавецтва імкнецца процістаяць часу... Толькі мастацтва можа даць прадмету другое жыццё... Мы, людзі творчай думкі, павінны шмат працаваць, каб пакінуць нашчадкам свой вопыт бараць-бы са злом...

У адным з пытанняў, якія былі зададзены на сустрэчы, студэнты цікавіліся, як, працуючы без натуры, мастак стварае такія рэалістычныя вобразы. Што дапамагае ў гэтым: нейкія асаблівыя ўласцівасці памяці або сваё, асаблівае разуменне свету?

Міхаіл Андрэевіч адказаў, што натура для яго — само жыццё. Уважліва назірае яго і адлюстроўвае пры дапамозе фарбаў. А натуршчыкаў у прамым сэнсе слова для Савіцкага сапраўды не існуе.

...Мастацкія вобразы да яго прыходзяць з памяці, апаленай вайной. Але, як вядома, Міхаіл Андрэевіч закончыў нядаўна цыкл «Купала і яго час». Напісаў адзінаццаць карцін па заказу літаратурнага музея Янкі Купалы. Мне здаецца, што зразумець прычыну стварэння гэтых палотнаў дапамогуць радкі з верша Петруся Броўкі:

«Каб сонца над нашай
Радзімаю ззяла,
І Колас нас клікаў і клікаў
Купала».

Раней мастак пісаў творы аб моцы, мужнасці, непахіснасці нашага народа ў цяжкія гады ліхалецця, калі трэба было змагацца за тое, «каб сонца над нашай Радзімаю ззяла». А цяпер ён паспрабаваў асэнсаваць вытокі духоўнага багацця народа.

— У сваіх карцінах купалаўскага цыкла я імкнуўся спалучыць вобразныя, дакументальныя, этнаграфічныя рысы,— растлумачыў М. Савіцкі.— Хацелася, каб у тых, хто будзе глядзець творы, узнікала пачуццё купалаўскай паэзіі.

Пытанні ўдзельнікаў сустрэчы да М. Савіцкага былі розныя: то сур'ёзныя, то жартаўлівыя, але ўсе яны паказалі, як уважліва сочыць моладзь за творчасцю мастака, як цікавіцца яго новымі задумамі.

Нядаўна Міхаілу Андрэевічу Савіцкаму споўнілася 60 гадоў. Яго творчасць была адзначана самай высокай узнагародай Радзімы — ордэнам Леніна.

У яго шмат новых задум. Адна з іх: акрамя сваёй пастаяннай працы ў галіне сюжэтна-тэматычных карцін, звярнуцца і да партрэтнага жанра.

...Ён піша, памятаючы аб тых, хто не прыйшоў з вайны, ён піша для нас, пакалення 80-х, ён піша для тых, хто прыйдзе пасля нас, для нашых нашчадкаў...

**Н. ШЧАЛКАНОГАВА.**

**НА ЗДЫМКАХ: выступае М. Савіцкі; кожнае слова народнага мастака дорага для студэнтаў; на памяць аб сустрэчы — аўтограф М. Савіцкага.**

Фота **В. Шачака.**

## ПАЧАТАК

ПАМЯТАЕЦЕ? «Возьмемся за руки, друзья...» Я вось адкрыў для сябе рабят, якія нездарма ўзяліся за рукі. А стварылі яшчэ аматарскі тэатр, адшукаўшы адзін у адным аднадумцаў, адчуўшы любоў да тэатральных падмосткаў і невычэрпнае жаданне стварыць нешта самім. Праўда, адкрыццю не прысвоены рэгістрацыйны нумар. Студэнцкія тэатры бударажылі жыццё яшчэ з часу вагантаў. Іншая справа, што зараз такія тэатры часта падобны адзін на аднаго, як блізняты. І не адшукаеш у іх толькі сэрцам адчувальныя студэнцкія ноткі гучання. А ў гэтага калектыву яны ў «плоці і крыві».

Яны адмовіліся рэпеціраваць у актавай зале. Не, не таму, што не было ўмоў. Перашкаджала яе акадэмічнасць. Аддаленасць гледача ад выканаўцаў пазбаўляла магчымасці весці давяральны дыялог. Гэта быў яшчэ пошук свайго «я». Так студэнцкая аўдыторыя ў несамавітым на выгляд старым вучэбным корпусе ва універсітэцкім скверы стала па вечарах — «іхняй». Потым, нядоўга мудруючы, назвалі сябе Тэатрам Вялікай Фізічнай. Бо ў ёй пачыналі пакутліва, упарта, робячы крок за крокам у адкрыцці сваіх герояў, саміх сябе.

У адзін з вечароў вахцёр, які бачыў нямала студэнтаў, са здзіўленнем услухоўваўся ў



**● 27 САКАВІКА — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ТЭАТРА**

# ВОЗЬМЕМСЯ ЗА РУКІ, СЯБРЫ...

Іх больш за сорак. Адкрыты толькі трэці тэатральны сезон. Але пра іх могуць доўга расказваць не толькі ў Мінску, але і ў горадзе беларускіх шахцёраў Салігорску, далёкай вёсачцы Бабоўня, у Рызе і Ленінградзе. Пра іх пішуць, спрачаюцца. Нават спрабуюць абагульніць вопыт. Гэта сёння. А ўчора шмат чаго было інакш. Прасцей кажучы, як ва ўсіх і ва ўсякага, у іх быў свой пачатак пачаткаў.

Студэнцкія калектывы асуджаны на пастаянную змену саставу. Народны тэатр Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна не выключэнне.

Верасень 1979. Стары састаў пакінуў тэатр цалкам. Выпускнікі. Змяніўся і кіраўнік. Набор навічкоў — справа быццам і не складаная, але і не такая простая. Напэўна, гэта і быў момант перараджэння старэйшага універсітэцкага калектыву, гісторыя якога пачалася яшчэ ў трыццатыя гады. Па шчасліваму супадзенню з навічкамі з першых дзён да позняга вечара «прападаў» чалавек здзіўляючы — Дзіна Георгіеўна Тыцюк. Яшчэ старшынёй студэнцкага клуба мастацкай самадзейнасці універсітэта яна «выношвала» ў душы запаветнае жаданне прысвяціць сябе маладзёжнаму тэатру.

Па-рознаму прыходзілі студэнты ў тэатр. Пеця Марцаў і Оля Дзямідава—каб паспрабаваць сябе на сцэне. Віця Каратай—з цікаўнасці. Сярожа Мацкевіч, Рая Бяшанава, Рома Кветнер, Лёша Шаранкоў—са студыі мастацкага слова, дзе займаліся ў Дзіны Георгіеўны. Алена Зайцава нейк забегла выпадкова, ды так і засталася. У будучым спектаклі яна сыграе адну з галоўных роляў. Прыходзілі многія, заставаліся не ўсе. Ішоў свой унутраны адбор. Акрамя Д. Г. Тыцюк, рэжысёра-педагога, чалавекам не менш цікавым з'яўляецца і Валерый Данілавіч Анісенка, які і стаў галоўным рэжысёрам ТЭАТРА ВЯЛІКАЙ ФІЗІЧНАЙ. Чаму так назвалі?

...Даўно патушана святло ў карпусах універсітэта. Асветлены толькі вокны Вялікай Фізічнай. Звычайная аўдыторыя ўвечары ператваралася ў пляцоўку для рэпетыцый, станавілася сцэнай спектакля. Яны адмовіліся рэпеціраваць у актавай зале...

Віск пілы, грукат малаткоў, што даносіліся з ВФ. Разгадка аказалася простай — майстравалі сцэну. Не чакаючы падказак, разам з Валерыем Данілавічам і Дзінай Георгіеўнай рабілі ўсё самі. Рэквізітары і асвятляльнікі, яны і касцюмы шылі самі па эскізах свайго мастака Людмілы Лобан. Гэта датыкненне да празаічных сакрэтаў работы збліжала, аб'ядноўвала.

А ў сваю першую п'есу проста закахаліся. Дагістарычная прытча-дэтэктыў «Дзве стралы» А. Валодзіна была блізкай да іх успрымання і па інтанацыі гучання. Перад тым, як узяцца за ролю, кожны шукае балявы момант у жыцці свайго героя. Галоўнага ці з масоўкі. Інакш не сыграць так, як хочацца. А праўдзівей — не «пражыць» на сцэне. Ад самога слова «сыграць» вее нечым ненатуральным, няшчырым. Нездарма ў ТВФ аб'яўлена барацьба з «прафесіяналізмам». Памяталі аб усім гэтым на першым спектаклі, памятаюць і зараз, калі на ўліку дваццаць пяты.

Прэм'еры чакалі і баяліся. Хацелася паказаць тое, дзеля чаго патрачана столькі часу і сіл. І застацца зразуметымі. Кастрычніцкі дзень набліжаў вечар хутчэй, чым калісьці. Праз гадзіну пачатак. А пакуль будучая Удава дамывала падлогу, Военачальнік займаўся на сцэне дэкарацыямі. Аратар і Вушасты, ворагі ў п'есе, дружна выносілі вучэбныя сталы... Нечаканасці для гледача пачыналіся прама ля ўваходу. Прывычных крэслаў не было. Толькі прыступкі аўдыторыі-амфітэатра, якія цягнуцца ўверх. Сцэна без заслоны. І акцёры паявіліся... сярод гледачоў.

Спектакль прайшоў на адным дыханні.

## СЦВЯРДЖЭННІ

**Студэнт:**

**— Гэта ж здорава! У нас свой студэнцкі тэатр. З нашымі клопатамі і праблемамі...**

**Тэатральны крытык:**

**— Больш за дзесяць гадоў ведаю універсітэцкі тэатр. І на гэты раз ішла з думкай, што ўбачу звычайны сярэдні ўзровень самадзейнага калектыву. І раптам такая крынічная чысціня, неадробленасць...**

**Чалавек ва ўзросце:**

**— Не магла стрымаць слёзы ў час многіх сцэн. Асабліва аплакванне Дзяўчынай каханага. Бачыла спектаклі прафесіяналаў і аматараў. Але такога ўзрушэння не зведвала ніколі.**



Так былі зроблены першыя крокі да таго, што іх аб'яднала. Матэматыкаў і хімікаў, філолагаў і радыёфізікаў...

**З кнігі водгукаў:**

**«Будзьце заўсёды такімі ЖЫВЫМІ і на сцэне, і ў жыцці. Гэта цяжка, але неабходна. І вы гэта можаце. А. Валодзін».**

**«Спадзяюся, што ідзём мы з вамі па адной сцяжынцы (да душы чалавечай), што наперадзе многа святла і многа надзей. І спадзяюся, што мы неабходны адзін аднаму. Алена Камбурава».**

**З аб'явы аб наборы: «ТВФ універсітэта патрабуюцца трагікі, комікі, травесці... Нам патрэбны проста ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ».**

**Асноўным прынцыпам існавання тэатра з'яўляецца: «Я адказваю за ўсё».**

**З маналогаў пра ТВФ:**

**В. Д. Анісенка: «Працую рэжысёрам тэатра-студыі кінаакцёра пры «Беларусьфільме». Але мяне заўсёды цягнула да самадзейных калектываў. Да іх шчырасці. Я не вучу рабят быць акцёрамі, не. Хутчэй, наадварот. не іграць, а жыць».**

**Іра Бірукова: «ТВФ — маё «племя», мае сародзічы. Радасна пасля ўдалых спектакляў. Няўтульна пасля няўдач. Наш тэатр — гэта калі ўсім НЕ ЎСЁ РОЎНА. Радасна, сумна, балюча, але не ўсё роўна».**

**Оля Дзямідава: «Належыць задумацца, што за штука наш тэатр, калі ён прымушае столькі чалавек жыць на адным дыханні, у адзіным парыве, моцна ўзяўшыся за рукі, быць разам».**

**Лена Зайцава: «Тут усё шчыра. Тут сяброўскія сувязі. Іх не перадаць. Іх трэба адчуць. Тут я буду, колькі змагу».**

## ПРАЦЯГ

Пачатак кожнай рэпетыцыі нязменна суправаджаецца сварлівым голасам вахцёршы: «Колькі можна! Лепш у кіно ішлі б...»

Але вось прычынены дзверы. Можна пачынаць. Праўда, яшчэ пры адной умове. Выйшаў на пляцоўку — спрабуй, імкніся, выкладвайся... Аднойчы знойдзенымі загатоўкамі карыстацца ўвесь час недаравальна. Без пастаяннай траты сябе нічога не атрымаецца. Непераканаўча. Рэжысёр не ўдаецца ў разважанні. «Калі не можам, нам няма чаго рабіць больш разам. Час разыходзіцца». Словы не могуць не закрануць. І калі нешта не атрымліваецца ў Сашы Дашчынскага — перажываюць усе...

Зараз ТВФ рыхтуе два новыя спектаклі: «Водпуск па раненню» У. Кандрацьева і «Яшчарку» А. Валодзіна. Як заўсёды, адно з галоўных жорсткіх патрабаванняў да рэпетыцый: прыходзіць з нечым дарагім — радкамі верша, якія запалі ў душу, газетнага артыкула, расказам дзядулі пра ваенныя дарогі. Усё абмяркоўваецца, асэнсоўваецца. Кожным. Паступова «пераплаўляецца» матэрыял для будучага спектакля. У ТВФ, акрамя акцёраў, растуць і свае рэжысёры. Жэзл на пастаноўку «Яшчаркі» ўручаны Роме Кветнеру. А на Малой сцэне Лена Анкудзінава ставіць «Смагу над ручаём» Ю. Эдліса.

Здараецца і такое, што навічкі просяць узяць у тэатр сярод тэатральнага сезона. Бяруць, калі адчуваюцца не толькі здольнасці, але і гарачае жаданне рабіць дабро. Так было з Сяргеем Розумам (цяпер любімы ўсімі Вушасты). А ланцужок набору такі: субяседаванне—сябры тэатра—кандыдаты — сапраўдныя члены. Прайсці яго не проста. Часам пакідаюць, нягледзячы на здольнасці. Галоўны лейтматыў — узаемаразуменне.

Рэпетыцыя — гэта не толькі работа на пляцоўцы. На ёй паспяваюць падзяліцца клопатамі, расказаць аб артыкуле пра Марыну Цвятаеву, абмяняцца кнігамі... А яшчэ з'есці пірог, які спёк незамяніммы асвятляльнік Саша Ямайкін, пачаставацца яблыкамі, што прынесла Таня Лясецкая... Яны гатовы разам праседжваць да паўночы. Не выпадкова ў іх распарадку ёсць дзень асаблівы, які называецца «клубным». Ва універсітэцкім інтэрнаце на Кастрычніцкай яго і праводзяць. У маленькай 308-й захоўваюцца афіша дэбюта і тэатральны фоталетапіс. Насценгазета. У ёй прызнанні ў любві да ТВФ, рэпартажы з «капуснікаў», дыскусіі пра сябе, аб тэатры.



Народ жа сабраўся розны. Якія мы зараз? Якімі быць далей? Тут выказваецца незадаволенасць сабой і спектаклямі. Калі Іра Бегмат раптам заўважае, што не адчувае разумеючых і проста добрых вачэй сваіх калег на рэпетыцыі — час біць трывогу. Заходзіць размова аб добразычлівасці. Масоўка пасіўная—зноў прычына пагаварыць сур'ёзна, без скідкі. Не ўсё бязвоблачна. Гэта зразумела. Калектыў расце, выхоўваецца і сам выхоўвае. Нездарма самае жорсткае пакаранне — адхіленне ад рэпетыцыі. А які ж тэатр без гастроляў! Апошнія, ленінградскія, асабліва памятныя. ТВФ і Ленінградскі эксперыментальны тэатр-клуб «Субота» — прыклад калектыўнай дружбы. І творчай і чалавечай. Нават створана экспромтам легенда пра дзве тэатральныя палавінкі, якія, доўга блукаючы па свету, нарэшце знайшлі адна адну.

І хаця стылістыка спектакляў і манера выканання ў калектываў неаднолькавыя, агульнае — імкненне даследаваць душу чалавечую. Здавалася б, ленінградскі глядач, распешчаны вядомымі парфесіянальнымі тэатрамі, наўрад ці зверне сур'ёзную ўвагу на нейкі самадзейны калектыў. Прагнозы не апраўдаліся. Такога грому авацый, такога «брава» ТВФ яшчэ не ведаў. Іх прызналі! А калі пасля тэатралізаванага расказу пра сябе і гледачы і выканаўцы зліліся ў адзіны круг, узяўшыся за рукі, ніхто ў гэтым ужо не сумняваўся. Ацэнка, якую выставіў сам А. Валодзін, самая высокая: «Мова маіх герояў зразумета, як нікім раней».

У клубныя дні працуюць секцыі паэзіі і тэатра, кіно і жывапісу. А на сустрэчах пры свечках можна пагаварыць і паспрачацца з прафесіянальнымі артыстамі і аматарамі, з людзьмі проста цікавымі.

...Дружна глядзяць слайды. Мараць пра тое, што змаглі б. А могуць яны шмат чаго. Нават сыграць спектакль на прыродзе, у лесе. Упершыню паспрабавалі пры закрыцці мінулагодняга сезона. І хаця не было афіцыйнай аб'явы аб спектаклі — у загараднай электрычцы аказалася каля 150 чалавек, якія ехалі разам з імі.

Ёсць у рабят з ТВФ няўмоўленае месца сустрэч. Маленькі пакойчык Дзіны Георгіеўны ў тым жа студэнцкім інтэрнаце. Застаўлены кніжнымі паліцамі, увешаны афішамі, пасланнямі рабят да розных дат. Сюды прыходзяць натоўпамі і па аднаму. З радасцямі і нягодамі. Усіх яна прыме, дапаможа, абавязкова напоіць чаем. Нават куплены спецыяльна вялізны самавар. Каб на ўсіх хапіла. Чай у Дзіны Георгіеўны — беражліва ахоўваемая традыцыя. Тут можна слухаць галасы Ахматавай і Еўтушэнкі, якія гучаць з пласцінак, музыку Баха і Скрабіна, і, канешне ж, спрачацца аб сваім тэатры, разбіраць рэпетыцыі. Перажываць за здачу экзаменаў.

...Заканчваецца рэпетыцыя. Гасне святло ў Вялікай Фізічнай. Стомленыя, ідуць рабяты па апусцеламу універсітэцкаму скверу. Рая Бяшанава з Сярожам Розумам вядуць размову пра апошнія сцэны «Водпуску па раненню», Эдзік Астроўскі і Пеця Марцаў — карыфеі «капуснікаў» — захоплена абмяркоўваюць сцэнарый прадстаячага Дня тэатра. Іна Луцэнка дамаўляецца пра білеты на вечар паэзіі і на прэм'еру ў купалаўскі... Вось і паварот. Каму куды. Перад развітаннем рытуал: узяліся за рукі, цесна сабраўшыся ў круг.

**М. ЛАХВІЧ.**

**НА ЗДЫМКАХ: сцэны са спектакля «Дзве стралы»; рэжысёр-педагог Д. Г. Тыцюк.**

Фота **З. Дзімeнтава, В. Шачака.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

25 сакавіка 1982 г.

АТ 15210 Заказ 608.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ